ПАДЗЕЯ




# ШЛЯХАМ ГАЮЧАГА РОДНАГА СЛОВА

**Духмянымі караваямі сустрэлі ўдзельнікаў Першага абласнога літаратурна-краязнаўчага форуму «Воранаўскія чытанні». 24 лістапада райцэнтр прымаў унікальнае па сваім змесце і патрыятычна-выхаваўчай місіі свята беларускага слова, гісторыі і культуры. У чытаннях прыняла актыўны ўдзел дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Ідэя форуму нарадзілася ў межах супрацоўніцтва паміж Воранаўскім райвыканкамам і Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы. Таму сярод гасцей з Гродна было шмат навукоўцаў. Гэта кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнавец, фалькларыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Руслан Казлоўскі; кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, крытык, паэтэса Аліна Сабуць і старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, крытык, паэтэса Святлана Тарасава. Таксама сярод удзельнікаў форуму – намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык і воранаўскія калегі: член СПБ, паэт Уладзімір Руль; аўтар некалькіх зборнікаў лірыкі, паэт Міхаіл Забалотны; журналіст «Воранаўскай газеты», паэтэса Марына Кандратовіч.

Адкрылі форум старшыня Воранаўскага райвыканкама Дзмітрый Захарчук і першы прарэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Аляксандр Карэўскі. У сваім прывітальным лісце ўдзельнікам «Воранаўскіх чытанняў» пажадаў поспеху і плёну старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр Карлюкевіч.

Работа форуму была арганізавана ў некалькіх тэматычных секцыях: «Воранаўшчына: культурная спадчына роднага краю», «Воранаўшчына: вядомыя і невядомыя старонкі гісторыі», «Славутыя людзі Воранаўшчыны», «Воранаўшчыне прысвячаецца» (раённы паэтычны конкурс) і праходзіла паралельна па часе адразу ў некалькіх аграгарадках раёна. Госці з Гродна працавалі ў секцыях у ролі экспертаў. Напрыклад, літаратары Аліна Сабуць, Дзмітрый Радзівончык, Уладзімір Руль, Міхаіл Забалотны і Марына Кандратовіч увайшлі ў склад журы раённага паэтычнага конкурсу «Воранаўшчыне

прысвячаецца» (ДУА «Канвелішская сярэдняя школа»), дзе свае літаратурныя здольнасці, а таксама ўвасобленыя ў мастацкім слове патрыятычныя пачуцці прадэманстравалі вучні школ Воранаўскага раёна і настаўнікі.

Сапраўднае захапленне ва ўсіх без выключэння гасцей «Воранаўскіх чытанняў» выклікалі шчырасць і сардэчная цеплыня мясцовых жыхароў, павага і ўвага з боку раённых уладаў. Воранаўскі край здаўна славіцца багаццем сваіх народных традыцый, гісторыі і культуры, якія тут ведаюць, шануюць і пастаянна даследуюць. Беларуская мова гучыць не толькі ва ўстановах адукацыі, але і на вуліцах. Кожны, хто аказваецца на Воранаўшчыне, адчувае поўны чалавечай дабрыні, непаўторны дух гэтага краю, атрымлівае порцыю душэўнага цяпла ад яго жыхароў. Гэта не можа не натхняць на творчасць і навуковыя даследаванні, на мірную стваральную працу! Гасціннасць, шчырасць, спагада беларусаў сустракаюць вас па ўсёй краіне. Тым не менш, на падмурку з такой гуманістычнай філасофіі Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці робіць сур'ёзную заяўку на лідэрства ў справе развіцця традыцый літаратуры і краязнаўства. З гэтай нагоды актыўнае і эфектыўнае супрацоўніцтва раёна з Купалаўскім універсітэтам выглядае заканамерным. Прыемна, што ў бягучым 2023 годзе нашымі калегамі па пісьменніцкай арганізацыі, навукоўцамі-філолагамі па ініцыятыве і пры падтрымцы раённых уладаў створана і выпушчана кніжная трылогія **«Мая Воранаўшчына»** з трох кніг: «Воранаўшчына лірычная. Зборнік вершаў педагогаў і вучняў Воранаўскага раёна»; «Воранаўшчына эпічная. Зборнік празаічных твораў педагогаў і вучняў Воранаўскага раёна» і «Воранаўшчына ў легендах і паданнях». Зборнік фальклорных твораў» (укладальнікі Р. К. Казлоўскі і А. Э. Сабуць).



Прэзентацыя кніжнай серыі «Мая Воранаўшчына»

Падчас секцыйных пасяджэнняў прагучалі змястоўныя даклады, цікавыя выступленні юных творцаў і даследчыкаў. Яны атрымалі аб'ектыўную ацэнку, каштоўныя заўвагі, парады экспертаў. Школьнікі пабачылі сучасных пісьменнікаў, навукоўцаў, пачулі іх выступленні. Адбыліся прэзентацыі калектыўных зборнікаў і аўтарскіх кніг гасцей. Літаратурна-краязнаўчы форум падкрэсліў непарыўнасць традыцый і сучаснасці, чалавечага патэнцыялу і творчага пошуку. Уявіце сабе, як цікава ўбачыць на старонках кніг нарыс пра свайго земляка, прачытаць вершы паэта, які жыве па-суседству... Цікава і вельмі карысна. Толькі так, праз набліжэнне да мастацтва і навукі аб ім можна дапамагчы маладому чалавеку пазбавіцца ад інтэрнэт-залежнасці, ад незайздроснай ролі прыдатка да гаджэту. Выхаваўчая мадэль граматнага спажыўца нам ужо знаёмая. Трэба крочыць далей. Надышоў час гадаваць новых творцаў!

Сёння мы шмат думаем над тым, як правільна выхаваць моладзь, выклікаць у яе цікавасць да вечных каштоўнасцей – патрыятызму, гуманізму, інтэлекту. У Воранаўскім раёне зрабілі стаўку на слова. Інвестыцыя ўжо прыносіць свой плён. Слова навуковае і мастацкае, сучаснае і фальклорнае – роднае беларускае слова прасьвятляе, натхняе, гуртуе людзей, дапамагае ўсвядоміць, якім вялікім багаццем надзяліла нас наша родная зямля, нашы слаўныя продкі, класікі. Не толькі зберагчы гэтую неацэнную спадчыну, але і папоўніць, прымножыць яе – абавязак сапраўднага грамадзяніна, сэнс нашага жыцця дзеля Радзімы, дзеля будучыні. Прыкладна так гучыць асноўная ідэя таго, што 24 лістапада адбылося на Воранаўскай зямлі.

Пасля заканчэння Першага абласнога літаратурна-краязнаўчага форуму «Воранаўскія чытанні» адбылася сяброўская гутарка гасцей з кіраўніцтвам Воранаўскага раёна. Абмяркоўваліся некаторыя вынікі і перспектывы. Зразумела, што эфект ад рэалізацыі праекта магчымы толькі ў выпадку яго працягу. Вырашана зрабіць «Воранаўскія чытанні» традыцыйнымі (праводзіць кожныя два гады) і падзяліцца ідэяй з іншымі раёнамі Гродзенскай вобласці.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** эпізоды Першага абласнога літаратурна-краязнаўчага форуму «Воранаўскія чытанні». Гродзенская вобласць, 24 лістапада 2023 года.

*Выкарыстаны фота з сайта «Воранаўскай газеты».*




Воранаўскі райвыканкам. Падчас урачыстага адкрыцця форума


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by







Аграгарадок Канвелішкі. Падчас раённага паэтычнага конкурсу «Воранаўшчыне прысвячаецца»




Эсэ юнай пісьменніцы з Воранаўшчыны Паліны Станкевіч – на старонках зборніка літаратурна-мастацкіх твораў да 895-годдзя горада Гродна «Лепшы горад Зямлі» (аўтарскі экзэмпляр уручае рэдактар кнігі А. Э. Сабуць)








«Воранаўскія чытанні» ў аграгарадку Канвелішкі. Аліна Сабуць і Дзмітрый Радзівончык



Дырэктар Канвелішскай сярэдняй школы Наталля Віктараўна Якжык – наш даўні і верны сябар


voran.by voran.by voran.by voran.by





У іншай секцыі «Воранаўскіх чытанняў» (аграгарадок Пагародна) працуюць члены СПБ, выкладчыкі Купалаўскага ўніверсітэта Руслан Казлоўскі і Святлана Тарасава






Воранаўскі раённы дом культуры. Фінальная частка мерапрыемства сустрэла каларытнай выставай вырабаў народных майстроў і праектаў бібліятэк раёна





Традыцыйныя беларускія дзеруны




voran.by voran.by voran.by voran.by


ПК-6
voran.by voran.by voran.by voran.by






Удзельнік «Воранаўскіх чытанняў», лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі ў намінацыі «Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства», кандыдат філалагічных навук Аліна Эдмундаўна Сабуць



Якое свята без падарункаў!



Кніга гродзенскага госця – у падарунак Воранаўскай раённай бібліятэцы



Заслужаныя ўзнагароды – юным паэтам








Першае месца раённага паэтычнага конкурсу ў Сандры Сварабовіч (аграгарадок Канвелішкі)


Літаратурна-паэтычны конкурс
Воранаўшчыне прысвячаецца
voran.by voran.by voran.by voran.by


ДЫПЛОМ
voran.by voran.by voran.by voran.by






Ля мікрафона старшыня Воранаўскага райвыканкама Дзмітрый Іванавіч Захарчук

Пра абласны літаратурна-краязнаўчы форум «Воранаўскія чытанні» – у рэпартажах «Воранаўскай газеты», аўтар Марына Кандратовіч:

[Частка 1]
[Частка 2]